# БЕЛАРУСКАЯ - САМАЯ МАЯ!

## *ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТОК №2*

*Кастрычнік сакавіку брат: сем пагод на дзень.*

Кожны чалавек захоўвае ў сваім сэрцы пачуццё ўдзячнасці да выкладчыка, які адчыніў перад ім дзверы ў краіну ведаў. Ніякі суперсучасны камп'ютарны клас, ніякія інавацыі не заменяць педагагічнага таленту, майстэрства і спагадлівасці. Акрамя ведаў і жыццёвага вопыту, вы перадаяце сваім навучэнцам часцінку сваёй душы, раскрываеце іх індывідуальныя здольнасці, падрыхтоўваючы кожнага да вялікага жыццёвага і прафесійнага шляху.




***Паважаныя выкладчыкі, віншуем Вас са святам!!!***

Збірае восень плён багаты.
Куды ні глянь –
Рабін кастры.
Кастрычнік – гэта ваша свята
І ў сэрцы, і ў календары.

Яшчэ з часін адвечных, даўніх,
Які б яму ні выпаў лёс,
Да вучняў ідучы,
Выкладчык
З сабой у сэрцы сонца нёс.

Яно ж, рассыпаўшы, як зерні,
Сваю святлынь, сваю любоў,
У душы сеяла праменні
Крылатых ведаў,
Родных слоў.

І той, хто зведаў гэту ласку
І таямніцы мудрых кніг,
Не быў глухі
Да мовы наскай,
Да добрых дзей бацькоў сваіх.

# *Гумарыстычная старонка*




- Малады чалавек, а вас не вучылі ў дзяцінстве саступаць месца ў транспарце пажылым людзям?

- Бабуля, але гэта ж мая машына!

*******

Дарагія сябры!
Дарагія жанчыны!
Дарагія дзеці!..
Не, ну ты паглядзі — усё падаражэла!!!

*******

Тата і сын ўпрыгожваюць ялінку. Сын пытаецца:
- Тата, а ты чаму цукеркі так высока на ялінку вешаеш?
- Гэта каб ты да Новага года іх ўсе ня з’еў!
- Дык мне што зараз, да Новага Года толькі “дожджыкам” падсілкоўвацца?..

# Ці ведаеце вы, што…

Самыя яркія старонкі беларускай гісторыі, унікальная прырода, самабытная культура і асобы, якія змянілі свет...



**Нацыянальны парк «Прыпяцкі» – адзінае месца на планеце, дзе існуюць першабытныя пойменныя дубровы.** У нацыянальным парку практычна ў некранутым стане захаваліся унікальныя пойменныя ландшафты Беларускага Палесся – з дзюнамі, катлавінамі і лагчынамі, дзе сярод дуброў і ясеннікаў размешчана больш як 30 азёр. На Палессі таксама захаваліся самыя вялікія прыродныя балоты ў Еўропе. Найбольш буйныя з іх – Званец (150 кв. км) і Дзікае (80 кв. км).



**Белавежская пушча – самы буйны старажытны лес Еўропы.** Звесткі пра пушчу сустракаюцца яшчэ ў антычнага гісторыка Герадота (5 ст. да н.э.) і ў Іпацьеўскім летапісе (983 г.). У канцы XIV ст. вялікі князь Вялікага княства Літоўскага Ягайла аб’явіў пушчу запаведнай і ўстанавіў забарону на паляванне. Старажытны лес ахоўваецца ўжо 600 гадоў. У Белавежскай пушчы налічваецца каля 2 тысяч дрэў-веліканаў. Некаторыя з іх з’явіліся яшчэ да адкрыцця Калумбам Амерыкі! Белавежская пушча ўключана ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.



**Нясвіж належаў роду Радзівілаў - аднаму з самых багатых у Еўропе.** Многім у сваім непаўторным абліччы Нясвіж абавязаны творам італьянскага архітэктара Яна Джавані Марыі Бернардоні. Па яго праектах у XVI стагоддзі ўзведзены замак і фарны касцёл Божага Цела – першае на тэрыторыі Рэчы Паспалітай збудаванне ў стылі барока. У храме знаходзіцца адзін з буйнейшых у Еўропе некропаль княжацкага роду, які налічвае 102 саркафагі членаў сям’і Радзівілаў. Нясвіжскі замак уключаны ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.